## З вопыту рэалізацыі інфармацыйна-адукацыйнага праекта «ШАГ» - «Школа актыўнага грамадзяніна» у дзяржаўнай установе адукацыі «Люсінская сярэдняя школа імя Якуба Коласа» Брэсцкай вобласці

**Тэма:** «Радзіма мая Беларусь у асобах. У гэтай прыгажосці велічнай ёсць доля працы маёй» (аб працаўніках прамысловасці і сельскай гаспадаркі).

**Мэта:** фарміраванне ў вучняў уяўлення аб сучасным развіцці прамысловасці і сельскай гаспадаркі, развіцце паважлівага стаўлення да дабрасумленнай працы ў сферы прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

**Удзельнікі:** вучні 8-11 классов ДУА «Люсінская сярэдняя школа імя Якуба Коласа».



23 лістапада 2023 года ў ДУА «Люсінская сярэдняя школа імя Якуба Колас»а ў рамках інфармацыйна-адукацыйнага праекта «Школа актыўнага грамадзяніна» прайшла інфармацыйная гадзіна на тэму «Радзіма мая Беларусь у асобах. У гэтай прыгажосці велічнай ёсць доля працы маёй» (аб працаўніках прамысловасці і сельскай гаспадаркі).

Занятак прайшоў у незвычайнай форме для вучняў. Рабяты разам з класным кіраўніком 10 класа Наумік Мартай Іосіфаўнай наведалі сучасную малочнагандлёвую ферму ААТ «ЛюсінаАгра» у вёсцы Макава, менавіта там і пачаўся самы пазнавальны этап ШАГ 1 «Мы даведваемся». Рашэнне аб пачатаку будаўніцтва новага сельскагаспадарчага комплексу было прынята яшчэ ў 2019 годзе, а абранае месца – вёска Макава. Чаму менавіта аддаленая вёска стала аб'ектам для мадэрнізацыі вучні здагадаліся хутка. Бяскрайнія палі, якія распрасціраюцца аккурат каля фермы – галоўная крыніца корму для жывёл. Далей увазе вучняў былі прадстаўлены і самі жывёлы, рабят здзівілі сучасныя умовы ўтрымання кароў – вынік штодзённай крапатлівай працы супрацоўнікаў фермы. Далей вучням прадэманстравалі сучаснае абсталяванне фермы, у тым ліку і навейшы даільна-малочны блок з абсталяваннем кампаніі «ДеЛаваль», пры дапамозе якога адначасова можна даіць каля 40 кароў.



Аб усім гэтым расказала і паказала загадчыца фермы Жалезная Таццяна Сяргееўна якая ўзначальвае малочнагандлёвую ферму ўжо год, з самага пачатку яе адкрыцця. Разам з ёю плённа працуюць 13 чалавек, клапатліва ажыццяўляючы догляд за 720 жывёламі. Загадчыца распавяла, што каровы з фермы «ЛюсінаАгра» даюць малако адно з самых якасных у раёне, а за год вытворчасць малака павялічылася амаль на тону – гэта вельмі значны паказчык. Такая рэзультатыўнасць залежыць ад тых людзей, якія кожны дзень працуюць на ферме, адказна ставяцца да сваіх абавязкаў, паважаюць сваю справу і справу калег.





Таццяна Сяргееўна падкрэсліла, што незалежна ад таго, у якой сферы працуюць людзі, галоўнай якасццю заўсёды павінна быць чалавечнасць, тады працаўнік будзе сумленна і адказна ставіцца да сваіх абавязкаў, якасна выконваць тыя задачы, якія перад ім паставіла яго ўстанова. Вось на такой ноце завяршыўся ШАГ 2 «Знаёмства з земляком».

Падводзячы вынік мерапрыемста пад час ШАГа 3 «Мы дзейнічаем» вучні адзначылі, што іх здівілі сучасныя падыходы ў сельскай гаспадарцы, спагадлівасць людзей, якія працуюць у гэтай сферы. Некаторыя вучні нават выказалі жаданне звязаць сваё жыцце з сельскай гаспадаркай. Марта Іосіфаўна адзначыла, што дзякуючы мадэрнізацыі малочнагандлёвай фермы, плённай працы людзей, невялічкая вёска Макава вядома ва ўсім раёне і нават за межамі яго.

*Курылік А.А.,намеснік дырэктара па асноўнай дзейначці*
*ДУА «Люсінская сярэдняя школа*
*імя Якуба Коласа»*